# Эстафета творчасці ад Змітрака Бядулі

**У літаратурным конкурсе “Беларускі салавей”, прымеркаваным да 135-х угодкаў Змітрака Бядулі, было больш за 800 удзельнікаў**

У галерэі “Лабірынт” Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ўрачыста ўшанавалі пераможцаў конкурсу. Ладзіўся ён у рамках праекта “На хвалі часу, у плыні жыцця”, быў ініцыяваны летась Нацыянальнай бібліятэкай пры ўдзеле газеты “Літаратура і мастацтва”, “Настаўніцкай газеты”, часопіса “Бярозка”, Вялікага тэатра Беларусі, Тэатра юнага гледача, канала “Культура” Беларускага радыё і радыёстанцыі “Цэнтр FM”. Абвестка пра конкурс пайшла шырокая, і ўрэшце ў ім паўдзельнічала 827 чалавек – як дзяцей, так і дарослых з розных куткоў Беларусі ды з замежжа.




Ганаровым госцем імпрэзы стаў Яфім Плаўнік – сын Змітрака Бядулі. Ён падтрымліваў творчую ініцыятыву, сачыў за ходам конкурсу, знаёміўся з працамі ўдзельнікаў. Віншаванні ад Яфіма Самуілавіча, пэўна, запомняцца пераможцам надоўга. Усе пераможцы атрымалі памятныя падарункі, віншаванні ад інфапартнёраў конкурсу. На імпрэзе выступала Алеся Сівохіна (аўтар песень, рэжысёр, мастацкая кіраўніца народнага літаратурнага тэатра “Жывое слова”) ды іншыя выканаўцаў. Вершы Змітрака Бядулі гучалі ў выкананні вучняў 34-й бабруйскай школы, зачытваліся некаторыя конкурсныя эсэ.

**Рыгор Гарэшка**